*Гоўзіч І.М.*
***БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. XI КЛАС***

# ТЭМА 1. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПЕРЫЯДУ 1966 – 1985 ГАДОЎ

1. Стварыце **літаратурную карту** вашага рэгіёна: пазначце на ёй месцы нараджэння пісьменнікаў-землякоў, іх літаратурны і жыццёвы шлях, памятныя мясціны і інш.




2. Правядзіце **міні-дыспут** па наступным выказванні: *«Масавая літаратура» добра вядомая і ў нашай краіне. Што вы можаце сказаць пра яе пашырэнне на Беларусі? Якія сюжэты, жанры, героі прываблiваюць беларускага чытача, на ваш погляд, і чаму?».*

Каб абгрунтаваць свой пункт гледжання, складзіце табліцу па наступным узоры:

| **Тэзіс** | **Аргумент** | **Цытата** |
|---|---|---|
| | | |

3. Ці згодныя вы з наступным тэзісам: Ідэалы «грамадства спажывання» хутка пашыраюцца і на Беларусі, хаця такім наша грамадства назваць нельга. Якія станоўчыя і якія адмоўныя рысы гэтага працэсу існуюць у нашай краіне, на ваш погляд? Які ўплыў гэта можа мець на беларускае грамадства? На беларускую літаратуру? Культуру?

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

**Напішыце рэцэнзію** на адзін з твораў масавай літаратуры і абмяркуйце яе ў класе.

### Памятка-парада для падрыхтоўкі рэцэнзіі

1. Знаходзячы ў дадатковай літаратуры неабходны для даклада матэрыял, імкніся занатаваць яго так, як бы ты яго рабіў у вуснай форме.
2. Рыхтуючы паведамленне, памятай: слухачам павінна быць цікава.
3. Абапірайся на правілы складання дакладу (пачатак павінен зацікавіць слухачоў; кампазіцыя залежыць ад тэмы і жанру выступлення; аргументуй свае думкі цытатамі; карыстайся праблемным спосабам выкладання; падтрымлівай цікавасць слухачоў на працягу ўсяго выступлення).
4. Умей зразумела выказаць сваё меркаванне: слухачам важна, як ты сам ставішся да гэтага пытання ці праблемы.

4. Падрыхтуйце **вуснае выказванне** на адну з прапанаваных тэм:

Чаму ваенная і вясковая тэматыка цікавяць беларускую літаратуру да нашага часу? Хто з пісьменнікаў – прызнаныя лідэры ў распрацоўцы ваеннай, вясковай і маральна-этычнай праблематыкі?

5. Якія творы літаратуры 60 – 85-х гадоў ХХ стагоддзя вам асабліва падабаюцца? Хто з пісьменнікаў гэтай пары больш глыбока зразумеў эпоху, стварыў найбольш запамінальныя вобразы герояў? **Падрыхтуйце мультымедыйную прэзентацыю**, прысвечаную творчасці гэтага пісьменніка.

6. Падрыхтуйце **даклад** на тэму «Творчыя сувязі пісьменнікаў Беларусі і Расіі ў 1966 – 1985 гады».

7. Уявіце, што з гісторыі літаратуры знік перыяд 1966 – 1985 гадоў. Паразважайце, што страцілася ў ёй?

8. Гэтую стужку неабходна запоўніць прозвішчамі пісьменнікаў, пералік твораў якіх знаходзіцца ніжэй (выкарыстаце веды, атрыманыя ў 10 класе).

1. Аўтар апавядання “Роднае карэнне”.
2. Самы вядомы ў Беларусі байкапісец.
3. Назва апавядання гэтага пісьменніка перакладецца як “Помні аб смерці”.
4. Аўтар апавяданняў “Ворагі”, “Кветка пажоўклая” і інш.
5. Гэты паэт сцвярджаў што “…рэчкі птушкамі створаны”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. Аўтар верша “О, Беларусь, мая шыпшына”.

7. Гэты паэт у вершы “Родная мова” сцвярджаў, што “Песню сваю, мову сваю / Я да грудзей прытульваю”.

8. Героі аднаго з раманаў гэтага пісьменніка знаходзіліся ў пошуках будучыні.

9. Аўтар п’есы “Зацюканы апостал”.

10. Аўтар рамана “Запіскі Самсона Самасуя”.

11. Аўтар хронікі, яка павінна была складацца з пяці раманаў, рукапісныя нататкі апошіх называюцца “За асакою бераг” і “Праўда вясны”.

12. Навэла гэтага пісьменніка называецца “Нябачная калекцыя”

13.Аўтар паэмы “Люцыян Таполя”.

14. Адзін з вешаў гэтага паэта называецца “Пахне чабор”.

15. Аўтар апавядання “Бондар”.

16. Продак гэтага пісьменніка ўдзельнічаў у паўстанні на чале з Кастусём Каліноўскім.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ